УДК 811.161.3'367'0
DOI: https://doi.org/10.31499/2415-8828.1.2020.204123

# ТЫПЫ ВЫКАЗНІКАЎ У ПОЛАЦКІХ ПАСЛАННЯХ

***Наталля Паляшчук***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык аддзела гісторыі беларускай мовы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (Мінск, Рэспубліка Беларусь)*
*e-mail: nata-poleshhuk@yandex.by*
*ORCID 0000-0002-0104-537X*

*У артыкуле паказана, што ў полацкіх пасланнях прадстаўлены простыя дзеяслоўныя, састаўныя дзеяслоўныя, састаўныя іменныя выказнікі, спосабы марфалагічнага выражэння якіх былі тыповыя. Адзначаецца распаўсюджанасць форм дзеясловаў 1-й асобы адзіночнага і множнага ліку, 2-й асобы множнага ліку, мужчынскага роду адзіночнага ліку, паколькі дакументы мелі адрасны характар. Для дзеясловаў у функцыі выказніка паказальнай з'яўляецца варыянтнасць афармлення іх форм, пазіцыйная замацаванасць у кампазіцыі дакумента.*

***Ключавыя словы:*** *старабеларуская літаратурна-пісьмовая мова; гістарычная граматыка; гістарычны сінтаксіс; просты дзеяслоўны выказнік; састаўны дзеяслоўны выказнік; састаўны іменны выказнік; полацкія пасланні.*

***Paliashchuk Natallia. Types of Predicates in Polotsk Letters.***

*The article discusses the types of predicates, the ways of their expression, and also their functional features in the Polotsk Letters, which are a part of a set of documents known as the Polotsk Charters. It is established that there are simple verbal predicates, compound verbal predicates, and compound nominal predicates in the Polotsk Letters. All of them are expressed by typical morphological means. For example, simple verbal predicates are built up by means of the verbs having one of the 3 moods: indicative, imperative or conditional; coming in 3 basic tenses: present, past (perfect and plusquamperfect) and future (future simple, future difficult I and future difficult II); being perfective and imperfective; singular and plural; the first, the second and the third person; masculine, less often – feminine and neuter gender. The first person singular and plural verb forms, and also the second person plural verb forms are widespread because of the targeted nature of the analyzed documents. The use of singular or plural forms traditionally depended on whether the addressee of a document, the performer of the action described in the letter was individual or collective. In addition, the plural forms as verbal predicates are noted: 1) if the author of the message was a person holding a high, privileged position in the society, 2) when the etiquette formula your mercy was used, usually referring to a collective addressee. The verb forms in this syntactic function are variable as evidenced, for example, by different personal endings of verbs and participles with a final rear-lingual sound in the stem, absence or presence of a link-word in the perfect, etc., positional fixation in document composition. This is the first study of the morphological expression of types of predicates and their functioning in the Polotsk Letters. The results obtained will become the basis for a comprehensive description of the syntactic structure of both this genre variety of business texts and the entire collection of documents of the ancient Polotsk land. They will be used in writing the collective monograph "The Historical Syntax of the Belarusian Language: Parts of the Sentence", which is being prepared at the Department of History of the Belarusian Language of the Center for the Belarusian Culture, Language and Literature Research of the NAS of Belarus.*

***Keywords:*** *the old Belarusian literary and written language; historical grammar; historical syntax; simple verbal predicate; compound verbal predicate; compound nominal predicate; the Polotsk Letters.*

© Паляшчук Н., 2020

Пасланні палачан гарадскім уладам Рыгі і Лівонскага магістрата з'яўляюцца адным з прадстаўнічых жанраў дзелавой пісьменнасці даўняй Полаччыны. У іх утрымліваліся, напрыклад, патрабаванні стварыць спрыяльныя ўмовы для гандлю палачан у Рызе і гарантыя забяспечыць тое ж для рыжскіх купцоў у Полацку, выслаць у Полацк палачан, якія правініліся, прымусіць рыжаніна Германа Зундара плаціць доўг пану Сеньку Рыгоравічу, просьба паведаміць вынікі перамоў палачан у Рызе і інш.

Пасланні з'яўляюцца часткай комплексу дакументаў, якія былі створаны ў 1263–1513 гг. на тэрыторыі Полаччыны, асвятлялі яе ўнутранае жыццё, сувязі з замежнымі дзяржавамі і вядомы ў гуманітарыстыцы пад назвай *полацкія граматы*. Г. Харашкевіч, укладальнік выдання "Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв.", праводзячы жанравую дыферэнцыяцыю дакументаў, звярнула ўвагу на дамінаванне тэкстаў, "якія адносяцца да сферы міжнародных стасункаў Полацка" [Полоцкие грамоты, 1977, вып. 1, с. 23]. "Дзякуючы трывалым і доўгім зносінам Полацка з Рыгай даследчыкі маюць даволі вялікі, а, галоўнае, унікальны корпус пасланняў: полацкіх – гарадскім уладам Рыгі і лівонскаму магістру, і вялікакняжацкіх … Большая частка гэтых пасланняў, у тым ліку пасланняў ваявод і ваяводскіх намеснікаў напісана старабеларускай мове" [Хорошкевич 2013, с. 17–18].

Полацкія граматы, у тым ліку і пасланні, неаднаразова былі аб'ектам і крыніцай інфармацыі для даследаванняў па гістарычнай лексікалогіі, марфалогіі, анамастыцы, стылістыцы (гл. работы А. Булыкі, Л. Вардамацкага, В. Галубовіч, А. Жураўскага, Т. Казачэнкі і інш.), з'яўляліся матэрыялам для гісторыка-лексікаграфічных даведнікаў ("Гістарычны слоўнік беларускай мовы", "Падручны гістарычны слоўнік субстантыўнай лексікі", "Кароткі гістарычны слоўнік беларускай мовы") [Паляшчук 2017б]. У работах па дыяхранічным сінтаксісе граматы (часта без уліку іх жанравай прыналежнасці) выкарыстоўваліся як ілюстрацыйны матэрыял, напрыклад у параграфах "Колькасна-іменныя і іншыя словазлучэнні ў ролі дзейніка", "Просты дзеяслоўны выказнік у старажытнай беларускай мове", "Назоўны прэдыкатыўны ў беларускай мове" і інш. калектыўнай манаграфіі "Нарысы па гісторыі беларускай мовы" [Нарысы 1957, с. 279, 281, 283, 289]; у параграфах "Дзейнік", "Састаўны выказнік", "Безасабовыя сказы", "Прыдатак" і інш. "Гістарычнай граматыкі рускай мовы" В. Баркоўскага і С. Кузняцова [Борковский, Кузнецов 1963, с. 322, 341, 400, 414]. В. Клімковіч з улікам лінгвістычных даных купчых лістоў і прывілеяў Полаччыны правяла параўнальна-супастаўляльны аналіз выкарыстання простых і складаных сказаў у дакументах Вялікага Княства Маскоўскага, Наўгародскага Княства, Вялікага Княства Літоўскага [Климкович 2013, с. 13–14].

Дадзены артыкул прысвечаны разгляду тыпаў выказнікаў, спосабаў іх выражэння і адметнасцей функцыянавання ў полацкіх пасланнях і з'ўляецца працягам публікацый па гістарычным сінтаксісе беларускай мовы, пытанні якога, як раней мы падкрэслівалі, адносяцца да найменш распрацаваных у беларускім мовазнаўстве [Паляшчук 2017а]. Сёння актуальным і запатрабаваным працягвае заставацца правядзенне навуковых распрацовак у гэтым напрамку на максімальна даступнай колькасці тэкстаў рознай жанрава-стылявой атрыбуцыі, лакальнай і храналагічнай прыналежнасці. Мы абралі ў якасці матэрыялу даследавання полацкія пасланні, 1) паколькі іх сінтаксічная сістэма *спецыяльна не вывучалася*, 2) *з мэтай прыцягнення даследчыцкай увагі*

да тэкстаў гэтага самабытнага жанру старабеларускай дзелавой пісьменнасці і іх *далейшага* лінгвістычнага і стылістычнага аналізу.

Вынікі ўпершыню ажыццёўленага вывучэння марфалагічнага выражэння простага дзеяслоўнага выказніка, састаўнога дзеяслоўнага выказніка і састаўнога іменнага выказніка і іх функцыянавання ў полацкіх пасланнях у перспектыве стануць базавымі пры правядзенні комплекснага апісання сінтаксічнага ладу як гэтай жанравай разнавіднасці дзелавых тэкстаў, так і ўсёй сукупнасці дакументаў даўняй Полаччыны; будуць выкарыстаны пры напісанні раздзелаў калектыўнай манаграфіі “Гістарычны сінтаксіс беларускай мовы: члены сказа”, якая рыхтуецца ў аддзеле гісторыі беларускай мовы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

**І. Просты дзеяслоўны выказнік** (ПДВ) выражаўся формамі *дзеясловаў абвеснага ладу цяперашняга часу*: 1-я ас. адз. л.: ***Не знаю*** *ѧ Тимофеѧ* (52, 1436–1437); ***Пишу*** *вамъ ω то* (72, 1445–1458); 2-я ас. адз. л.: *а в то$^{м}$ мною* ***водишь*** (125, 1465); 3-я ас. адз. л.: *А ω$^{н}$* ***молить*** *б(о)га за вашу м(и)л(о)$^{с}$ть* (76, да 1446 г.); ***пишетъ*** *к нам панъ Михаило* (94, 1451); *Хто покоꙗ* ***ище$^{т}$(ь)****, тотъ покои знаидеть* (130, 1466); 1-я ас. мн. л.: ***Давамы*** *ва$^{м}$ поздоровенье си$^{м}$ наши$^{м}$ листо$^{м}$* (111, 1463); *А та$^{к}$же* ***възъꙗвляемъ*** *вашеи м(и)л(о)$^{с}$ти* (157, 1475); *мы деи мешчане полоцкии, а земли по$^{д}$ собою* ***мае$^{м}$*** *купъчии, а с того* ***служи$^{м}$*** *путъною слу$^{ж}$бою в па$^{н}$цирех* (25, 1508); 2-я ас. мн. л.: *какъ вы* ***вѣдаете*** *у своемъ праве* (71, 1445–1458); *што вы имъ кривду* ***чините*** *и безправъе великое, оу нꙗцтво и$^{х}$ имаючо,* ***сажаете*** *оу свои казни* (97, 1458–1460); 3-я ас. мн. л.: *што же оу на$^{с}$* ***ходѧтъ*** *по своеи воли* (50, да 1432 г.); ***оуводѧть*** *мѣсти$^{ч}$(о)въ полоцки$^{х}$ ... А ины$^{х}$ на мѣсте поимавъ и ωсоромотивъ, оу стѣну* ***сажають*** (106, 1459). Прыведзеныя прыклады ілюструюць варыянтнасць афармлення асабовых канчаткаў дзеясловаў цяперашняга часу. Так, напрыклад, дзеясловы 1-й ас. мн. л. у названай сінтаксічнай функцыі выступалі з флексіямі -*мъ,* якая была замацавана за старабеларускімі тэкстамі рознай храналагічнай і жанравай прыналежнасці, і -*мы.* Пры гэтым -*мы* адзначана ва ўстойлівых выразах тыпу *давамы поздоровенье* (118, 1464), *просимы вашу милость* (124, 1465) у дакументах 60-х гадоў XV ст., якія адносяцца да арыгінальных беларускіх тэкстаў ранняга перыяду. Гэта ў сваю чаргу з’яўляецца ўдакладненнем наступнага палажэння з манаграфіі “Мова беларускай пісьменнасці XIV–XVIII стст.”: “Трэці варыянт -*мы* ў беларускай пісьменнасці ранняга перыяду адзначаецца выключна ў перакладных творах” [Мова 1988, с. 180]. Неаднастайнасць афармлення канцавых -*ть,* -*тъ,* -*т* (вынасны) дзеясловаў 3-й ас. абодвух лікаў звязана як з адлюстраваннем на пісьме норм жывой народнай мовы і традыцыйнага правапісу, так і з вядомай непаслядоўнай перадачай *ь* і *ъ* на канцы слоў. Варта прыняць пад увагу і “свядомае імкненне зрабіць разнастайным арфаграфічнае афармленне канчаткаў, што давала чытачу па-свойму ўспрымаць іх у залежнасці ад дыялектнай прыналежнасці чытача і яго адукацыйнага ўзроўню” [Мова 1988, с. 178].

З дзеясловаў прошлага часу асноўным спосабам выражэння ПДВ у полацкіх пасланнях быў перфект, які перадаваў “безадноснае мінулае дзеянне, уключыўшы ў сябе і значэнні ранейшых аорыста і імперфекта” [Мова 1988, с. 189]. Мэтазгодна назваць некаторыя асаблівасці яго выкарыстання ў названай сінтаксічнай функцыі:

1) ролю звязкі выконвалі розныя формы дзеяслова *быти*: *есми* (1-я ас. адз. л.): ***врозумѣл есми,*** *што ми пишетѣ про попа* (14, 1392–1415); *есмы, есме, есмо* (1-я ас. мн. л.), пры адвочнай перавазе апошняй: *тѣмъ вѣдомо буди,*

*какъ миръ* ***есмы створи***$^{л}$***(и)*** (1, 1263); *мы ратьмане ризькии* ***скончали есме*** *съ полочане* (34, 1405); *а на то*$^{м}$ *... печати свои приклали, и с тою грамотою* ***послали есмо*** (40, 1409); *еси* (2-я ас. адз. л.): ***приезди***$^{л}$ ***еси*** *к боѧро*$^{м}$ *полоцкы*$^{м}$ (103, 1459); *есте* (2-я ас. мн. л.; захавала нязменны выгляд на працягу ўсяго старабеларускага перыяду): ***Есте присла***$^{л}$***(и)*** *к на*$^{м}$ *ратмана Федора ... и то*$^{г}$*(о) ч(е)лов(е)ка, што* ***есте*** *его* ***казни***$^{л}$***(и)****, а и тотъ стру*$^{г}$ *съ товаро*$^{м}$ (40, 1409);

2) пануючай формай выражэння перфекта ў разглядаемых дакументах выступаў дзеепрыметнік прошлага часу на *-лъ* без звязкі: *И людники* ***выговорили****, што же Пантелеи* ***налъса*** *Петру за добрые селедьци* (43, да 1412 г.); *тое повѣтрие* ***оути***$^{х}$***ло*** (122, 1465);

3) дзеепрыметнікі прошлага часу з асновай на заднеязычны і зычны ў полацкіх пасланнях прадстаўлены як з канцавым *-л*, які ўжываўся ў гэты перыяд у старабеларускай пісьменнасці па традыцыі, так і без яго, што было звязана з адлюстраваннем на пісьме адметнасцей жывога маўлення: *коли вже к вамъ нашь* ***прибѣглъ*** (51, 1435–1436); *Тимофеи* ***оумерлъ*** *оу Ризе* (52, 1436–1437); *паньскии слуга ... ѡ*$^{т}$ *пана* ***побѣгъ*** *к Чорторыискому* (72, 1445–1458); *Юрьи* ***ре***$^{к}$ (180, 1480–1484);

4) выкарыстанне звязкі ў складзе перфекта і яе адсутнасць. Звычайна звязка не фіксуецца ў сказах з дзейнікам, выражаным як асабовым займеннікам, так і назоўнікам: *онъ тати тыи* ***поима***$^{л}$ (57, 1440); *што мы имъ на то* ***дали*** (109, 1463); *А ваши рижане то* ***видѣли*** *... А перед нами полочане* ***слюбили*** (109, 1463). Даволі паслядоўна звязка адзначаецца пры адсутным дзейніку і выказніку, рэпрэзентаваным дзеясловам множнага ліку: *Што* ***есте присла***$^{л}$***(и)*** *к на*$^{м}$ *ратмана Федора .., што* ***есте казни***$^{л}$***(и)*** *.., што* ***есте поима***$^{л}$***(и)*** (40, 1409); *Што первѣи сего* ***писали есмо*** *к ва*$^{м}$ … (109, 1463), але: *мы ратьмане ризькии* ***скончали есме*** *съ полоча*$^{н}$*(е)* (34, 1405). Выпадкі перфекта са звязкай і без яе звязкі назіраюцца і ў межах аднаго дакумента: *мы по тому слюбенью по Гармонову ваши*$^{х}$ ***есмо*** *купцов* ***пропустили*** *– А также* ***послали*** *слугу своего Дашка и полочанъ до Риги ... А ѡ*$^{т}$*сюле* ***поѣхали*** *водою* (75, 1446). Такая неаднастайнасць сведчыла, трэба меркаваць, аб замацаванні ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове перфекта без звязкі.

*Плюсквамперфект* як аналітычны спосаб выражэння ПДВ перадаваў дзеянне, якое адбылося раней за іншае мінулае дзеянне. У склад плюсквамперфекта ўваходзіў сэнсавы дзеепрыметнік на *-лъ* і дзеяслоў *быти* ў форме перфекта: *Паньский слуга ...* ***былъ збродилъ*** (72, 1445–1458); *што* ***сѧ бы***$^{л}$ *ему* ***записа***$^{л}$ (73, 1445–1458). У якасці ПДВ функцыянавалі ў тэкстах і так званыя дзеясловы новага даўномінулага часу, якія ўтвараліся пераважна ад “беспрыставачных дзеясловаў пры дапамозе суфіксаў *-ива-* (*-ыва-*) і *-ва-* з пэўнымі фанетычнымі змяненнямі зычнага ў аснове і часам з чаргаваннем каранёвага галоснага” [Мова 1988, с. 213]: *бы*$^{л}$ *оу него торговчи*$^{к}$ *и съ его пенѧзми* ***ежджива***$^{л}$ ***торговыва***$^{л}$*, на имѧ Тараско* (91, 1449–1451); *которые н(а)ши люди з волостеи н(а)ших Задвински*$^{х}$ *По*$^{л}$*теск* ***рубливали*** *и*$^{з}$*давна* (155, 1475).

Дзеясловы ў *простай форме будучага часу* як простыя дзеяслоўныя выказнікі абазначалі дзеянне, аднесенае ў план будучага, ці дзеянне, якое пачынаецца ў цяперашнім часе, а закончыцца ў будучым. Такія формы супадалі з формамі цяперашняга часу, таму ўтваралі тую ж сістэму асабовых форм у адзіночным і множным ліках. Адзначаецца перавага дзеясловаў, утвораных часцей пры дапамозе далучэння прыставак да асноў цяперашняга часу дзеясловаў незакончанага трывання [Груцо 1960, с. 162]. Напрыклад, *которыи*

*наши торговци восхотѧть на конехъ ехати, и ко$^{л}$(ь) к на$^{м}$* ***възьеду$^{т}$(ь)****, тогды мы вашь товаръ* ***ѡ$^{т}$пусти$^{м}$*** (40, 1409); *какъ ѧ* ***съеду*** *на низъ и ѧ тобѣ* ***оузошлю*** *тоть слишокъ воску* (52, 1436–1437); *хто ѡ$^{т}$ насъ вамъ листъ нашь* ***принесеть*** (71, 1445–1458). ПДВ, выражаны *складанымі формамі будучага часу I*, указваў на працяглыя, незавершаныя або паўторныя дзеянні, якія адбудуцца ў будучым. У яго структуру ўваходзілі інфінітыў асноўнага дзеяслова і дапаможны дзеяслоў *быти* ў асабовай форме, чаму садзейнічала адцягненасць яго лексічнага значэння, няздольнасць выражаць дадатковыя мадальныя адценні: *што* ***боудоуть*** *вашеи м(и)л(о)$^{с}$ти* ***говорити*** *наша братьꙗ, и вы бы имъ верили* (85, каля 1448 г.); *которыи потом* ***будеть*** *о$^{т}$ на$^{с}$ горо$^{д}$ По$^{л}$теск* ***де$^{р}$жати*** (155, 1475).

Адзначаецца выкарыстанне ў функцыі ПДВ *складаных форм будучага II* (*раней будучага*) *часу*, якія прадстаўлены дапаможным дзеясловам *быти* і дзепрыметнікам на *-л* і звычайна служылі для перадачы будучага дзеяння, якое будзе выконвацца раней за іншае будучае дзеянне: *И мы ... ви$^{н}$ны$^{х}$ скарае$^{м}$, которые* ***будуть*** *чого* ***заслꙋжили****, ка$^{к}$ право вкажеть* (183, 1481). Да сярэдзіны XVI ст. будучы II, як лічыцца, быў уласцівы галоўным чынам тэкстам дзелавога зместу, у якіх яго “можна кваліфікаваць як рэлікт старажытнай сістэмы ў адрозненне ад пісьменнасці пазнейшага часу, дзе ён ужываўся ў іншых сінтаксічных умовах пад уплывам польскай мовы” [Жураўскі 1967, с. 48].

З *дзеясловаў загаднага ладу*, якія служылі сродкам рэалізацыі ПДВ, перавагу мелі сінтэтычныя ўтварэнні 2-й ас. адз. і мн. л., паколькі пасланні насілі адрасны характар і ўтрымлівалі зварот да адной асобы / групы асоб. Напрыклад, 2-я ас. адз. л.: ***торгуи*** *..,* ***поедь*** *доброволно* (40, 1409); ***Вѣрь*** *пану Ганꙋсу Филиповичю* (125, 1465). Выключна такія формы фіксуюцца ў формулах пажадання, што ўтрымлівалі зычэнні здароўя адрасату, а таксама членам яго сям’і: *Б(о)гъ* ***даи*** *вашѣ (так!) м(и)л(о)$^{с}$ти жити здоровы$^{м}$, а и същастъны$^{м}$* (159, 1476); 2-я ас. мн. л.: *вы его* ***сошлите*** *к на$^{м}$ на ни$^{з}$ оковавше* (68, 1445–1458); *того* ***ѡсмотритѣ*** *и справѣдливо на$^{м}$* ***вчинитѣ*** *тому* (163, 1476); *мое* ***ѡ$^{т}$даитѣ****, а свое болшѣе* ***возмитѣ*** (176, 1480). Выбар флексіі ў множным ліку залежаў ад месца націску ў слове, ад спражэння дзеяслова, аднак назіраліся і адхіленні ад гэтай заканамернасці (напрыклад, *возмитѣ* (I спр.) замест чаканага *возмѣтѣ*) [падрабязней гл.: Мова 1988, с. 223–225].

З аналітычных форм загаднага ладу дамінуюць спалучэнні часціцы *нехай* і дзеяслова ў цяперашнім або будучым часе 3-й ас. мн. л.: *Ку$^{п}$цѣ* ***нехаи ѣду$^{т}$(ъ)*** *и съ своею торговълею ... А наши* ***нехаи*** *до ваши$^{х}$* ***ѣду$^{т}$(ь), торгую$^{т}$(ь)*** *межи себе доброволно* (130, 1466); ***Нехаи*** *ми на то* ***присягнѣ$^{т}$****(ь), а ꙗ хочꙋ те ꙋсе поплати$^{т}$(и)* (180, 1480–1484). Яны атрымалі рэпрэзентацыю ў пасланнях, што датуюцца другай палавінай XV ст. Формы з часціцай *да* сустракаюцца ў формулах бласлаўлення, адзначаных у пасланнях, адрасантам якіх з’яўляліся прадстаўнікі царкоўнай улады: *А м(и)л(о)$^{с}$ть б(о)жьѧ и наше бл(а)г(о)$^{с}$(ло)в(е)ние* ***да будеть*** *со всими вами* (77, 1447).

Сродкам рэалізацыі ПДВ выступалі таксама *дзеясловы ўмоўнага ладу*, якія перадавалі дзеянне як пажаданае ці магчымае пры пэўных умовах і выражаліся аналітычна: 1) спалучэннем былога дзеяслова *быти* ў форме аорыста (старажытны варыянт *быхомъ / абыхомъ* і новы *быхмо / абыхмо*) і дзеепрыметніка на *-лъ*: ***быхмо*** *ѡ$^{т}$ вашѣи м(и)л(о)$^{с}$ти пѣвность ѡ ты$^{х}$ рѣчо$^{х}$* ***вѣдали*** (142, 1470); ***быхо$^{м}$*** *то$^{т}$ товаръ* ***вѣрнули*** *ва$^{м}$ на того Гануса* (149, 1471); 2) спалучэннем *бы* (*абы*) і перфекта асноўнага дзеяслова: *Просили его*

*м(и)л(о)$^{с}$ти ... **абы** имъ въ ихъ купли и оу воску нигде ганьбы и подозреньꙗ **не было*** (116, 1464); И *ваша **бы** м(и)л(о)$^{с}$ть тако$^{ж}$ наши$^{м}$ та$^{м}$ справѣдливость **дѣлали*** (135, 1469). Такім чынам, у пасланнях адлюстраваны вядомыя старабеларускай мове структурныя пераўтварэнні форм умоўнага ладу.

Інфінітыў у функцыі ПДВ у прааналізаваных крыніцах рэалізуе значэнне неабходнасці, абавязковасці выканання пэўнага дзеяння: *полочано$^{м}$ добровольно **еха$^{т}$(и)** к Ризѣ ... доброволно ему **купи$^{т}$(и)** и **прода$^{т}$(и)**, ... никакое малое торговле **не торговати**, ... вѣсцю **ѡ$^{т}$ступи$^{т}$(и)** прочь ѡ$^{т}$ скалвъ а рукою **не прима$^{т}$(и)**, а вѣсебное **имати** вѣсцю ка$^{к}$ оу Полоцку на рижане$^{х}$ емлю$^{т}$(ь)* (38, 1407). Пры неазначальнай форме дзеяслова, як відаць з экземпліфікацыі, звычайна адзначаюцца назоўнікі са значэннем асобы, асабовыя займеннікі ў форме давальнага склону, што абазначалі як пэўную сукупнасць людзей, так і канкрэтную асобу.

**II.** У структуру **састаўнога дзеяслоўнага выказніка** (СДВ) уваходзілі выказальнае слова, прадстаўленае інфінітывам, і дзеяслоўная звязка, выражаная формамі фазісных дзеясловаў: *коли **починаете грабити** правы$^{х}$ людеи* (65, 1441–1444); ***началъ сѧ** оу пана **просити** к Ризѣ ѡпѧть* (72, 1445–1458); мадальных дзеясловаў: *мы вамъ тако$^{ж}$ противу **хочем приѧти*** (51, 1435–1436); *Чернѧта **хотелъ** тотъ слишо$^{к}$ **ѡ$^{т}$колупити** про$^{ч}$(ь)* (52, 1436–1437); *И мы оуже болши того **не може$^{м}$ терпети*** (68, 1445–1448); *што **иметь** вамъ Коурило **говорити**, и вы томоу **вѣрьте*** (64, 1441–1442); *што **иму$^{т}$(ь)** вашеи м(и)л(о)$^{с}$ти слово$^{м}$ **молъвити*** (114, 1464); *и$^{ж}$ за того рукою **маешь** тую со$^{л}$(ь) **побрати*** (125, 1465); ***маеть приказывати** и **ро$^{з}$давати** дело волостем Двиньским* (155, 1455); *А то$^{т}$ попе$^{л}$ **ме$^{л}$ дати** на ро$^{к}$ под свои$^{м}$ брако$^{м}$* (180, 1480–1484). Трэба звярнуць увагу, што аналітычныя ўтварэнні з дзеясловамі *почьну, хочю, имамь* у даўняй пісьменнасці маглі мець значэнне будучага складанага I, пры гэтым часта з мадальнымі адценнямі неабходнасці, магчымасці ажыццяўлення дзеяння. Паводле аўтараў “Гістарычнай граматыкі рускай мовы”, яны ўяўляюць сабой хутчэй свабодныя сінтаксічныя спалучэнні, чым складаныя аналітычныя формы. “Акрамя таго, не заўсёды ясна, ці мае дзеяслоў, які спалучаецца з інфінітывам, толькі значэнне дапаможнага дзеяслова для ўтварэння будучага часу ці ж захоўвае і сваё лексічнае значэнне” [Борковский, Кузнецов 1963, с. 262]. Сведчаннем сказанага вышэй з’яўляюцца назіранні В. Зіманскага, паводле якіх у Вісліцкім статуце (1423–1438) дзеяслоў *имати* для выражэння “чыстага” будучага часу зафіксаваны ў 2,9 % кантэкстаў [Зіманскі 2002, с. 67]; у 56 % – ён рэалізуе дадатковыя мадальныя адценні – “гатоўнасці да дзеяння, неабходнасці выканання дзеяння ў будучым і намеру, жадання яго выканаць” [Там жа, с. 68].

**III. Састаўны іменны выказнік** (СІВ) у пасланнях Полаччыны прадстаўлены дастаткова шырока. Адносна яго выражэння і функцыянавання можна зрабіць наступныя высновы:

1) у структуры СІВ звязка можа прысутнічаць, можа быць апушчана, што назіраецца часам у межах аднаго кантэксту: *То рѣчь **есть** велми **проста*** (130, 1466); *Колко **было** и$^{х}$ товару **забавлѣно** и **положено** в ц(е)ркви, то все **дано** и$^{м}$* (146, 1471); *теперь то$^{т}$ ро$^{к}$ оуже **есть близко*** (147, 1471); *ѧ емоу чимъ **винова$^{т}$ бы$^{л}$**, а ѧ емоу **не виноватъ** ничим* (172, 70–80-я гг. XV ст.);

2) у якасці звязкі выступалі ў асноўным розныя часавыя формы дзеяслова *быти*: *што ныне **живи суть*** (1, 1263); *што$^{ж}$ **виноватъ бы$^{л}$** вашому немчину рижанину Индрику берковоскъ воску* (73, 1445–1458), ***будет ли** рижанинъ оу на$^{с}$ **винова$^{т}$** ... и **будет ли** на$^{ш}$ полочанинъ оу ва$^{с}$ **виноватъ*** (94, 1451). Пры

гэтым аорыст названага дзеяслова фіксуецца пераважна ў ранніх дакументах: *А **писа^н^(а) бысть** сиѧ грамота въ Полоцку* (40, 1409);

3) іменная частка рэпрэзентавана часцей назоўнікамі, прыметнікамі, дзеепрыметнікамі, прыслоўямі: *А Петрови тые люди **не племѧ*** (43, да 1412 г.); *Ку^п^це^м^ везде дорога **чиста бывае^т^(ь)*** (130, 1466); *Полтескъ те^ж^ **есть**, хвалѧчи Б(ог)а, **мѣсто** словутное, ка^к^ и которое, а **не есть нижшое** во ч(ес)ти и во все^м^ ни Вилни, а ни Мариборка, а ни Кгданьска* (118, 1464); *дерево **побрано*** (136, 1469); *Оу то^м^ ми щъкоды **стало мно^г^(о)*** (180, 1480–1484);

4) іменныя часціны мовы ў складзе СІВ ужыты ў назоўным склоне; прыметнікі і дзеепрыметнікі, акрамя таго, прадстаўлены пераважна ў кароткай форме: *а оу на^с^ ваши^м^ купцо^м^ ризски^м^ пу^т^(ь) **ч(и)^с^тъ** к Витебску и к Смоленску* (75, 1446); *товаръ его **ѡ^т^данъ** ему испо^л^на бѣзъ его щкоды* (201, 1487–1492);

5) СІВ, іменная частка якога выражана дзеепрыметнікам *писанъ*, выкарыстоўваецца ў канцавым пратаколе пасланняў – у формуле datum (утрымлівала характарыстыку дакумента паводле часу і месца яго стварэння): ***П(и)са^н^** оу Полоцку авгу^с^(та) 9 д(е)нь* (106, 1459); *А **п(и)са^н^** оу Полоцкꙋ іюля 13 д(е)нь въ д(е)нь с(вя)т(о)го арханг(е)ла Гавриила* (135, 1469);

6) СІВ буди ведомо: ***бу^ди^ ведомо** всим добрым людем, н(ы)нѣ и потом, всим почестливым, хто нашь листъ узрить или услышить его чтꙋчи* (171, 1478) – мае месца ў канструкцыях пачатковага пратакола дакументаў – у формуле promulgatio (публічн*а*е *а*б'яўленне).

Такім чынам, у полацкіх пасланнях у розных па будове сказах прадстаўлены простыя дзеяслоўныя выказнікі, састаўныя дзеяслоўныя выказнікі, састаўныя іменныя выказнікі, спосабы марфалагічнага выражэння якіх былі тыповыя (напрыклад, просты дзеяслоўны выказнік рэпрэзентуюць дзеясловы абвеснага, загаднага і ўмоўнага ладу, цяперашняга, прошлага (перфект, плюсквамперфект) і будучага (будучага простага, будучага складанага І, будучага складанага ІІ) часу, закончанага і незакончанага трывання, адзіночнага і множнага ліку, 1-й, 2-й, 3-й асобы, мужчынскага, радзей – жаночага і ніякага роду).

Адзначаецца распаўсюджанасць форм дзеясловаў 1-й асобы адзіночнага і множнага ліку, 2-й асобы множнага ліку, мужчынскага роду адзіночнага ліку, паколькі прааналізаваныя дакументы мелі адрасны характар. Параўн.: *Ѡ^т^ бояръ полоцки^х^ и мѣща^н^ все^г^(о) поспо^л^(ь)ства ты^м^ почестливы^м^ и ѡпатрьны^м^ пано^мъ^ бꙋрмистро^м^ и воито^м^ и рѧдца^м^ и всѣмъ ратмано^м^ Ризкого мѣста наша вѣрнаѧ приꙗзнь* (135, 1469); *Ѡ^т^ Яна Юрьевича, марша^л^ка короля ег(о) м(и)л(о)^с^ти, намѣстника поло^ч^кого, приꙗтеле^м^ и сусе^до^мъ наши^м^ милы^м^, бꙋрмистрꙋи ра^т^мано^м^ и вси^м^ мѣщано^м^ мѣста Ри^з^ского покло^н^* (198, 1487).

Выкарыстанне дзеясловаў адзіночнага ці множнага ліку залежала ад таго, з'яўляўся адрасант / адрасат дакумента, выканаўца апісанага ў дакуменце дзеяння індывідуальным ці калектыўным. Акрамя таго, формы дзеясловаў множнага ліку традыцыйна адзначаюцца, калі 1) пасланне накіроўвалася асобай, якая займала высокую пасаду, як, напрыклад, у пасланні полацкага епіскапа Сімяона ад 4 мая 1470 г.: ***Бл(агос)л(о)влѧемъ** ва^с^, наши^х^ сꙋседо^в^ и приꙗтелѣи,* але тут жа: *А **повѣдаю** вашеи м(и)л(о)^с^ти, што ж есть ч(о)л(о)в(е)к згодныи*; 2) пры этыкетнай формуле *ваша милость*, якая з'яўлялася абазначэннем адрасата, звычайна калектыўнага, першы раз названага ў пачатковым пратаколе дакумента, пры яго паўторным упамінанні: *штобы ваша м(и)л(о)^с^ть та^м^ наши^м^ во всѣ^м^ справѣдливость **чинили**, ка^к^ же и*

*своимъ, бы та$^{м}$ жадному нашому ѡ$^{т}$ ваши$^{х}$ щкоды и кривды и посмѣха и бою не было* (126, 1466).

Для дзеяслоўных форм, засведчаных у функцыі выказніка ў полацкіх пасланнях, паказальнай з'яўляецца варыянтнасць, аб чым сведчыць, напрыклад, рознае афармленне асабовых канчаткаў дзеясловаў, дзеепрыметнікаў з асновай на заднеязычны і зычны, адсутнасць / наяўнасць звязкі (форм дзеяслова *быти*) у перфекце як рэпрэзентанта ПДВ.

Варыянтнасць назіраецца таксама пры афармленні састаўнога іменнага выказніка, што праявілася ў непаслядоўнай фіксацыі ў яго складзе дзеяслова-звязкі.

**ЛІТАРАТУРА**


Борковский, В. И. и Кузнецов, П. С. (1963). *Историческая грамматика русского языка*. Москва, 512 с.

Груцо, А. П. (1960). Будучы просты час у мове беларускай пісьменнасці XIV–XVII стст. [У:] *Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР*. Мінск, вып. VII, с. 159–172.

Жураўскі, А. І. (1967). *Гісторыя беларускай літаратурнай мовы*. Т. 1. Мінск, 332 с.

Зіманскі, В. Э. (2002). *Мова беларускай пісьменнасці ранняга перыяду (на матэрыяле Вісліцкага статута XV ст.)*. Дыс. ... канд. філал. навук. 10.02.01. Віцебск, 233 л.

Климкович, О. А. (2013). *Язык и стиль русских и белорусских актовых документов XIV–XVI вв.* Автореф. дис. … канд. филол. наук. 10.02.02, 10.02.01. Минск, 26 с.

*Мова беларускай пісьменнасці XIV–XVIII стст.* (1988). А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, І. І. Крамко, У. М. Свяжынскі. Мінск, 320 с.

*Нарысы па гісторыі беларускай мовы* (1957). А. Я. Бірала [і інш.]. Мінск, 450 с.

Паляшчук, Н. В. (2017а). Гістарычны сінтаксіс беларускай мовы: стан і перспектывы вывучэння. [У:] *Беларуская граматыка: ад Браніслава Тарашкевіча да сучаснасці*. Зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Мінск, 19–20 студз. 2017 г. В. А. Мандзік і інш. (рэдкал.). Мінск, с. 131–138.

Паляшчук, Н. В. (2017б). Полацкія граматы: з гісторыі вывучэння ў беларускім мовазнаўстве. [В:] *Идеи. Поиски. Решения*. Сб. ст. и тез. X Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 23 нояб. 2016 г. В 6 ч. Ч. 1. Н. И. Нижнева (отв. ред.). Минск, с. 81–87.

*Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв.* (1977–1985). Сост. А. Л. Хорошкевич. Москва, вып. 1, 226, [2] с.; вып. 2, 217, [2] с.; вып. 3, 212, [2] с.; вып. 4, 216, [2] с.; вып. 5, 194, [1] с.

Хорошкевич, А. Л. (2013). Терминология и дипломатика полоцких коммуникативных документов как когнитивный код. [В:] *Человек-творец в художественном пространстве славянских культур*. Сб. ст. Н. М. Куренная, М. В. Лескинен (отв. ред.). Москва ; Санкт-Петербург, с. 16–49.



*Подано до редакції 14.04.2020 року*
*Прийнято до друку 14.05.2020 року*